**МАТЭРЫЯЛЫ ГЭТАГА НУМАРА НАШАЙ ГАЗЕТЫ — АБ АШЧАДНЫХ І ПЫТЛІВЫХ, ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫХ ДЛЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СПЕЦЫЯЛІСТАХ, ВЫХАВАНЦАХ ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА**

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 34 (128) | Субота 18 лістапада 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

## НА ГОД МЫ СТАЛІ ДАРОСЛЕЙ




СТАЛА добрай традыцыяй у першую суботу пасля Кастрычніцкіх свят праводзіць традыцыйны вечар студэнтаў-эканамістаў. На гэтым вечары калектыў факультэта падводзіць вынікі сваёй работы за папярэдні навучальны год, намячае новыя мэты, бярэ сацыялістычныя абавязацельствы.

Мінулыя гады былі вельмі адказнымі ў станаўленні калектыву факультэта, арганізацыі вучэбнага працэсу, развіцці вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы, стварэнні гурткоў мастацкай самадзейнасці, камплектаванні зборных каманд па відах спорту.

На працягу 6 семестраў, якія прайшлі з моманту першага прыёму студэнтаў-эканамістаў у ГДУ, факультэт займаўся ў трох карпусах у дзве змены. Адчуваўся недахоп памяшканняў і падручнікаў, лабараторый. Не хапала высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Было цяжка, але з самага пачатку студэнты-эканамісты былі настроены аптымістычна. Іх дружба мацнела з кожным днём, рос калектыў выкладчыкаў, ствараліся і развіваліся традыцыі.

Асабліва знамянальным у гэтых адносінах быў мінулы навучальны год. На факультэце была адкрыта першая спецыяльная кафедра эканомікі працы. Нашы студэнты сталі пераможцамі рэспубліканскага агляду навуковых работ і заахвочаны на Усесаюзным аглядзе.

На факультэце няўхільна павышаецца паспяховасць студэнтаў. Па гэтаму паказчыку ўжо два семестры эканамісты займаюць другое месца ва ўніверсітэце. Студэнцкі будаўнічы атрад «Эканаміст-72» быў удастоены гонару прадстаўляць універсітэт на будоўлях Казахстана. У нас створан эстрадны аркестр. Упершыню факультэт выступаў асобнай камандай у круглагадовай універсітэцкай спартакіядзе.

Студэнты факультэта актыўна ўключыліся ў грамадскае жыццё універсітэта. Арганізавана і паспяхова прайшлі практыку на прамысловых прадпрыемствах, у вылічальных цэнтрах, на машыналічыльных станцыях і ў навукова-даследчых установах Беларусі.

Выкладчыкамі і студэнтамі праводзілася і ажыццяўляецца вялікая работа па прыцягненню на факультэт дастойнага папаўнення. Яго мы ўжо трэці год атрымліваем з падрыхтоўчага аддзялення нашага універсітэта.

Ужо зараз мы задумваемся над тым, каб абітурыент-73 быў яшчэ лепшым, чым у папярэднія гады. Для гэтага мы плануем правядзенне традыцыйнага вечара «Эканаміст-72», дзён адкрытых дзвярэй, выязных канцэртаў, пасяджэнняў школ і алімпіяд.

Цяпер мы ўжо больш упэўнена можам гаварыць і пра перспектывы далейшага развіцця факультэта. У будучым навучальным годзе атрымаем новы вучэбны корпус са спецыялізаванымі лабараторыямі і кабінетамі. Выкладчыцкі калектыў папоўніцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі, узбагаціцца матэрыяльна-тэхнічная і вучэбна-метадычная база. Гэта — яскравы прыклад таго, як выконваюцца Пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» і «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных».

**І. ТРАЦЭЎСКІ,**
**дацэнт, дэкан факультэта.**

## НА ЗАКЛЮЧНЫМ КАНЦЭРЦЕ

У мінулую нядзелю глядзельная зала Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна была запоўнена да адказу. Тут праходзіў заключны канцэрт фестывалю мастацкай самадзейнасці г. Гомеля, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР.

Канцэрт адкрыў харавы калектыў Гомельскай фабрыкі «Праца».

Упершыню з незвычайна шырокай праграмай была прадстаўлена мастацкая самадзейнасць нашага універсітэта. Гледачы вельмі цёпла ўспрынялі выступленні чытальніка ГДУ Мікалая Велішкевіча і танцавальнага калектыву. Апладысментамі ўзарвалася зала, калі вядучы аб'явіў, што выступае вакальна - інструментальны ансамбль «Радзімічы». Ужо гэты факт сведчыць аб тым, што ён, нягледзячы на сваю кароткую біяграфію, заваяваў вялікую папулярнасць у гамяльчан і асабліва сярод моладзі. Своеасаблівая выканаўчая манера, беларускі нацыянальны каларыт, як кажуць, уласны почырк — усё гэта ўласціва для маладога таленавітага ансамбля.

У зале зноў авацыя. Са сцэны, быццам па хвалях, выплыла песня. Яна аб роднай Беларусі, аб горкім мінулым і цудоўнай сучаснасці, аб радаснай будучыні нашага Палескага краю. У зале не было раўнадушных, усе з хваляваннем слухалі музычную кампазіцыю «Гусляр» і высока ацанілі майстэрства яе выканаўцаў.

З цікавасцю было ўспрынята і выступленне адзінага ўдзельніка ў сваім жанры Тамары Магілёўцавай, якая імітыравала дзіцячы голас.

Строгае журы на заключным канцэрце гарадскога фестывалю мастацкай самадзейнасці, як і гледачы, дало высокую ацэнку аматарам сцэнічнага мастацтва нашага універсітэта.

**М. БАЙДА,**
**старшыня прафкома.**

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

### ЛЕКЦЫЙ, ДАКЛАДАЎ І ГУТАРАК ПА МАТЭРЫЯЛАХ МАЙСКАГА (1972 г.) ПЛЕНУМА ЦК КПСС — «АБ АБМЕНЕ ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ»

КПСС — кіруючая і накіроўваючая сіла савецкага грамадства ў барацьбе за пабудову камунізму.

Ленінскія ідэйныя і арганізацыйныя асновы партыі, нормы партыйнага жыцця і прынцыпы партыйнага кіраўніцтва.

Праграма і Статут КПСС — асноўныя кіруючыя дакументы партыі.

Членства КПСС. Статут КПСС аб абавязках і правах камуніста.

Ленінскія прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізму ў будове і дзейнасці партыі.

Ідэйнае і арганізацыйнае адзінства — крыніца сілы і непераможнасці Камуністычнай партыі.

Калектыўнасць — вышэйшы прынцып партыйнага кіраўніцтва.

Крытыка і самакрытыка — выпрабаваны метад выпраўлення недахопаў, паляпшэння справы.

Партыйны білет — асноўны дакумент члена КПСС.

XXIV з'езд КПСС аб удасканальванні форм і метадаў арганізацыйна-партыйнай і масава-палітычнай работы ў сучасных умовах.

Падрыхтоўка да абмену партыйных дакументаў — важнейшы этап ва ўмацаванні партыі і павышэнні яе кіруючай ролі ў камуністычным будаўніцтве.

Ленінскія прынцыпы і нормы членства ў КПСС і іх ажыццяўленне ў дзейнасці партыі.

У. І. Ленін аб высокім званні і асабістым прыкладзе камуніста.

Выконваць авангардную ролю на вытворчасці і ў грамадска-палітычным жыцці — абавязак камуніста.

## РАДАСНА АДЗНАЧЫЛІ СВЯТА




Гэты фотаздымак быў зроблены нашым карэспандэнтам 7 лістапада — у дзень святкавання 55-ай гадавіны Вялікага Кастрычніка. У шматтысячных калонах прайшлі на дэманстрацыі шчаслівыя і радасныя выхаванцы Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

# ФАКУЛЬТЭТ — КУЗНЯ

* * *

## НАШЫ ЗАДАЧЫ

Сёлетні навучальны год праходзіць у знамянальны перыяд падрыхтоўкі да 50-годдзя ўтварэння СССР — гэтага вялікага свята нашага шматнацыянальнага народа. Ён выстаўляе новыя патрабаванні перад усім калектывам факультэта і яго грамадскімі арганізацыямі.

Партыйная арганізацыя сумесна з дэканатам правяла вялікую работу па стварэнню моцнага і дысцыплінаванага калектыву. Побач з выхаваннем вядзецца вялікая індывідуальная работа са студэнтамі. Мы дабіваемся, каб кожны студэнт не толькі паспяхова вучыўся, але і глыбока разумеў палітыку нашай партыі і быў актыўным правадніком яе ў жыццё. Асобнае месца ў сучасных умовах займае эканамічная падрыхтоўка кадраў.

Студэнты павінны авалодаць марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыяй, як вечна жывым, пастаянна развіваючымся вучэннем. Цяпер фігура «чыстага» эканаміста толькі па чутках знаёмага з практыкай беззваротна адыйшла ў мінулае. Дыплом павінен засведчыць здольнасці выпускніка, не проста каменціраваць тыя або іншыя палажэнні тэорыі, а перш за ўсё даследваць разнастайныя бакі сённяшняга эканамічнага жыцця. Абсалютная паспяховасць на факультэце ў летнюю экзаменацыйную сесію склала 98,4 працэнта. Дастойнае месца ў барацьбе за высокія паказчыкі паспяховасці займаюць камуністы. Усе камуністы — студэнты вучацца на добра і выдатна, а В. Трухаў, В. Наважылаў — выдатнікі вучобы.

У гэтым навучальным годзе партыйная арганізацыя факультэта папоўнілася яшчэ пяццю камуністамі—студэнтамі, якія ўжо праявілі сябе актыўнымі грамадскімі работнікамі. В. Дзюба выбран партгрупоргам студэнцкай партгрупы першага курса, М. Бордак — камсоргам першага курса, а В. Растаргуеў прымае актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці. На другім і чацвёртым курсах таксама створаны студэнцкія партгрупы, якія з'яўляюцца баявой адзінкай курса.

Моц і сіла савецкага грамадскага ладу непарыўна звязаны з прагрэсам навукі і адукацыі. Партыя разглядае прагрэс навукі і тэхнікі як галоўны рычаг стварэння матэрыяльнай базы камунізму. Эфектыўным стымулам прафесіянальнага росту з'яўляецца далучэнне маладых людзей да навуковай работы, якая цяпер становіцца арганічнай часткай вучэбнага працэсу. Ею ў нас займаецца вялікая колькасць студэнтаў. У гэтай рабоце дасягнуты пэўныя поспехі.

Асноўная ўвага ў палітыка-масавай рабоце, адказным за якую з'яўляецца член партбюро В. С. Дайнека, удзялялася павышэнню ўзроўню ідэйнай пераканансці студэнтаў у праваце справы камуністычнага будаўніцтва, выхаванню ў іх пачуцця патрыятызму, пралетарскага інтэрнацыяналізму, стварэнню згуртаванага калектыву, які мае грамадска значымыя мэты і традыцыі. З гэтай мэтай партыйная арганізацыя і дэканат ажыццяўлялі сістэматычны кантроль правядзення палітінфармацый у вучэбных групах, падрыхтоўцы да Ленінскага заліку, арганізавалі лекцыі па міжнароднаму становішчу, сустрэчы з работнікамі эканамічных служб. На факультэце функцыяніруе клуб цікавых сустрэч «Малады эканаміст», на пасяджэннях якога выступалі галоўныя эканамісты, начальнікі эканамічных аддзелаў прамысловых прадпрыемстваў горада Гомеля. Вялікім аўтарытэтам у студэнтаў факультэта карыстаецца газета «Эканаміст». Яе рэдактар В. Наважылаў і члены рэдкалегіі Н. Аненкава, А. Тамашук, А. Цімашэнка, Г. Грыб, С. Грэнчанка, В. Горбаль, М. Ткачоў зрабілі газету цікавай.

Культурна-масавая работа, адказнай за якую з'яўляецца член партбюро І. Хадалевіч, ахапіла пераважную большасць студэнтаў факультэта. Яна адлюстравалася ў арганізацыі сустрэч з цікавымі людзьмі нашага горада, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, правядзенні вечароў, канферэнцый чытачоў па кнізе «Ад Гомеля да Эстрэмадуры» Я. Драбінскага. Да студэнтаў прыйшлі аўтар і сястра галоўнага героя гэтай кнігі Е. Дворнікава. Студэнты факультэта сустракаліся з навучэнцамі школ горада Гомеля і выступалі з канцэртамі перад рабятамі на прадпрыемствах горада Гомеля, у вайсковай часці.

Дабраахвотная народная дружына, кіруемая членам партбюро студэнтам В. Трухавым, ахапіла вялікую колькасць студэнтаў факультэта. Яе работа была заахвочана парткомам універсітэта, а рад дружыннікаў з'яўляецца няштатнымі супрацоўнікамі АУС і дзіцячых пакояў міліцыі.

Камуністы нашай партыйнай арганізацыі, якія ўзначальваюць многія ўчасткі работы, забяспечваюць яе дакладны рытм.

Нам неабходна дабівацца, каб студэнты, а затым і маладыя спецыялісты авалодалі асновамі марксісцка-ленінскай навукі, мелі глыбокую тэарэтычную і прафесіянальную падрыхтоўку, авалодалі высокімі маральнымі якасцямі і ўмелі працаваць з людзьмі. У гэтым партыйная арганізацыя эканамічнага факультэта бачыць галоўную задачу.

**Н. ВОЛКАВА,**
**сакратар партбюро факультэта.**

## АД ТЭОРЫІ ДА ПРАКТЫКІ

Мінула гарачае лета. Убраны калгасныя нівы. Наступіў неспакойны час вучобы. І студэнты спяшаюцца на заняткі. Трэба атрымаць літаратуру, своечасова падрыхтавацца да семінарскіх і практычных заняткаў. А студэнтам IV курса, будучым эканамістам па працы, трэба было зрабіць справаздачы за трэці курс аб сваёй рабоце на прадпрыемствах, дзе яны праходзілі тэхніка-эканамічную вучэбную практыку. Праграма практыкі шырокая, насычаная пытаннямі, якія звязаны з арганізацыяй вытворчасці і эканомікай прадпрыемстваў. Нягледзячы на кароткі тэрмін (з 29 мая па 22 ліпеня — праходжанне практыкі), усе студэнты з гэтай самастойнай работай паспяхова справіліся. Большасць студэнтаў з веданнем справы, грунтоўна і падрабязна адказвала членам камісіі на зададзеныя пытанні па праграме праходжання практыкі.

Сур'ёзную ўвагу студэнты звярнулі на пытанні па распрацоўцы норм затрат працы, вывучэнню выкарыстання часу асобнымі рабочымі на працягу рабочага дня, арганізацыі заработнай платы, захавання працоўнай дысцыпліны. Яны ўнікалі ў арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва і іншыя пытанні вытворчасці.

У групе Т-41 усе студэнты абаранілі справаздачы толькі на добра і выдатна. Высакаякасна выкананы справаздачы ў студэнтаў В. Трухава, Н. Якаўлевай, В. Наважылава, В. Горбаль, Т. Сяргеевай Г. Дайнека і інш.

Аднак не ўсе добрасумленна падрыхтаваліся да абароны справаздач. Здавальняючыя адзнакі атрымалі Л. Бухцілава, Л. Шыдлоўская, В. Жукаў.

Хачу пажадаць на будучае, калі студэнты прыступяць да практыкі па сваёй спецыяльнасці, каб яны глыбей унікалі ў эканоміку прадпрыемстваў, аналізавалі паказчыкі работы, спрабавалі рабіць вывады аб выніках работы прадпрыемстваў і ўносілі прапановы аб паляпшэнні іх дзейнасці.

Акрамя таго, неабходна звярнуць увагу на афармленне справаздач. Акуратная, пісьменная, сістэматызаваная справаздача характарызуе вас, як добрых будучых спецыялістаў-эканамістаў па працы.

**Л. КАШПЕРКА,**
**выкладчык.**

## КАМСАМОЛЬСКІЯ ВАЖАКІ

17 кастрычніка быў праведзен камсамольскі сход першага курса, на якім было выбрана камсамольскае бюро. З інфармацыяй выступіў сакратар камсамольскай арганізацыі эканамічнага факультэта студэнт III курса А. Сасноў. Ён расказаў аб традыцыях факультэта, а таксама выказаў спадзяванне, што першакурснікі дастойна прымуць эстафету старэйшых.

У камсамольскае бюро курса былі выбраны: Е. Сямхова, Л. Зубчанок, М. Бордак. Сакратаром бюро быў выбран камуніст Міхаіл Бордак. Мы спадзяемся, што жыццё нашых першакурнікаў будзе цікавым і захапляючым.

Шчаслівай дарогі табе ў навуку і жыццё, першы курс эканамічнага!

**Л. ЗУБЧАНОК,**
**студэнтка гр. Т-12.**

## СТАЛА ТРАДЫЦЫЯЙ

Ужо стала добрай традыцыяй праводзіць у другую суботу лістапада вечар эканамічнага факультэта. Яму папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа ўсіх студэнтаў. Нашымі гасцямі былі прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў горада, студэнты іншых факультэтаў, выпускнікі школ. Усе прысутныя адразу ж звярнулі ўвагу на маляўнічае афармленне залы. У гэтым вялікая заслуга рэдкалегіі газеты «Эканаміст», і ў прыватнасці, А. Цімашэнкі, Н. Аненковай, В. Горбаля, В. Наважылава, В. Балвака і іншых. Плакаты, дыяграмы, малюнкі расказалі гасцям аб вучобе, рабоце і адпачынку.

Вечар адкрыў дэкан І. П. Трацэўскі. Ён расказаў аб тым, якая работа праведзена намі, што прадстаіць яшчэ вырашыць. Затым выступілі сакратар камітэта камсамола факультэта А. Сасноў, сакратар прафбюро Т. Борсук, старшыня савета СНТ М. Ткачоў, выпускнік падшэфнай сярэдняй школы № 8 і іншыя.

За актыўную навуковую работу, за добрую вучобу і ўдзел у грамадскім жыцці факультэта вялікая група студэнтаў была ўзнагароджана граматамі.

Новую праграму паказаў калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта.

Вечар прайшоў з вялікім поспехам.

**В. ЭЛЬКІН,**
**студэнт.**





Многія дысцыпліны даводзіцца вывучаць будучаму эканамісту. Уважліва слухаюць студэнты лекцыю па бухгалтарскаму ўліку, якую праводзіць выкладчык Вячаслаў Іосіфавіч Марцінкевіч.

## РОЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ

У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» ўказваецца на неабходнасць узняць ролю універсітэтаў, ператварыць іх у вядучыя вучэбна-метадычныя цэнтры вышэйшай адукацыі. У Пастанове падкрэсліваецца, што задачы сучаснага этапа камуністычнага будаўніцтва, паскарэння тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу патрабуюць далейшага ўдасканалення навучання і выхавання спецыялістаў, значнага павышэння якасці іх падрыхтоўкі. Гэтыя ўказанні партыі і ўрада цалкам адносяцца і да падрыхтоўкі эканамістаў у нашым універсітэце.

На старшых курсах эканамічнага факультэта ГДУ (на III і IV курсах) цяпер навучаецца больш як 200 студэнтаў. Якасць іх ведаў, тэарэтычная ўзброенасць перш за ўсё залежыць ад прафесараў і выкладчыкаў. На першых курсах выкладчыкі кафедр грамадскіх навук фарміравалі марксісцка-ленінскі светапогляд будучых эканамістаў, выпрацоўвалі ў моладзі дакладны класавы падыход да з'яў і фактаў грамадскага жыцця.

У студэнтаў старшых курсаў асноўны ўпор робіцца на глыбокую тэарэтычную і прафесіянальную падрыхтоўку. У вырашэнні гэтай задачы важную ролю павінны адыграць спецыяльныя кафедры.

У мінулым годзе на эканамічным факультэце была створана кафедра эканомікі працы. Цяпер на ёй працуе 5 кандыдатаў эканамічных навук і дацэнтаў і два выкладчыкі, якія не маюць вучоных ступеней і званняў. Яны абавязаны забяспечыць нармальны вучэбны працэс больш чым па 20 дысцыплінах і курсах, большасць якіх з'яўляюцца прафіліруючымі (эканоміка прамысловасці, статыстыка, эканоміка працы, НАП, тэхнічнае нарміраванне і інш.). Зразумела, што ахапіць такое шырокае кола спецыяльных навуковых дысцыплін сіламі адной кафедры цяжка. Але, нягледзячы на гэта, мы маем пэўныя поспехі ва ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы. Дзякуючы вялікім намаганням выкладчыкаў кафедры кандыдата эканамічных навук Т. Д. Трацэўскай, Л. А. Салохінай і іншых, мы маем станоўчыя вынікі ва ўдасканаленні лекцыйных курсаў і практычных заняткаў, правядзенні тэхніка-эканамічнай практыкі студэнтаў старшых курсаў. Пры праходжанні практыкі нашы студэнты паказалі добрую тэарэтычную падрыхтоўку.

